УПРАЎЛЕННЕ АДУКАЦЫІ ВІЦЕБСКАГА АБЛВЫКАНКАМА

# **М а т э р ы я л ы**

**другога этапу (раённы, гарадскі) Рэспубліканскай алімпіяды**
**па беларускай мове і літаратуры**
**для вучняў IX класа ўстаноў адукацыі**
**Віцебскай вобласці**
**(2015/2016 навучальны год)**

ВІЦЕБСК · 2015

Другі этап (раённы, гарадскі) Рэспубліканскай алімпіяды праводзіцца ў 3 туры (два – у пісьмовай форме і адзін – у вуснай) па асобных заданнях для IX, X, XI класаў. Працягласць тураў для ўсіх класаў складае 6 гадзін: напісанне водгуку – не больш за 2,5 гадзіны; комплексная работа па беларускай мове і літаратуры – не больш за 2 гадзіны; вуснае выказванне – на падрыхтоўку кожнаму ўдзельніку да 20 хвілін, на адказ – да 5-7 хвілін.

Удзельнікам другога этапу ва ўсіх класах для вуснага выказвання прапануюцца білеты, у склад якіх уваходзяць дзве тэмы. Удзельнік выцягвае білет і выбірае адну з дзвюх прапанаваных тэм.

Комплексная работа па беларускай мове і літаратуры выконваецца на аркушах, дзе змешчаны заданні. Перад пачаткам правядзення комплекснай работы па беларускай мове і літаратуры, а потым перад водгукам запаўняюцца бланкі асабістых картак, на якіх змяшчаецца шыфр удзельніка.

**Пры выкананні заданняў комплекснай работы па беларускай мове і літаратуры за кожную дапушчаную памылку здымаецца 0,2 бала.**

<u>Падчас ацэнкі водгуку і вуснага выказвання карыстацца строга крытэрыямі, якія дадаюцца.</u>

***Другі этап (раённы, гарадскі) Рэспубліканскай алімпіяды***
***па беларускай мове і літаратуры***

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Намеснік старшыні
абласнога арганізацыйнага камітэта
Рэспубліканскай алімпіяды,
першы намеснік
начальніка ўпраўлення адукацыі Віцебскага
аблвыканкама

Л.М.Сцяпанаў

”05“ лістапада 2015 года

# Водгук на мастацкі твор
## IX клас

Уладзімір Караткевіч
Бацькаўшчына

Дагарэў за брамай небакрай,
Месяц паміж воблачкаў плыве.
Выйду зноў, як у мінулы май,
Басанож прайдуся па траве.
Дымная, сцюдзёная раса,
Цёмныя ў траве ад ног сляды.
А такога рослага аўса
Я не бачыў доўгія гады.
Бач, хмызы спляліся, як павець,
Светлякі мігцяць, гарачь святлей.
Перад тым як звонка ў лозах пець,
Прачышчае горла салавей.
Лашчыцца трава да босых ног.
З дальніх паплавоў плыве ракой
Ледзь прыкметны сумны халадок –
Подых юні ўходзячай маёй.
Паімчаць за ёю наўздагон? –
Хоць і схопіш – усё адно падман.
Дзе каханне тых мінулых дзён –
Весніх паркаў бэзавы туман?
Нават шкадаванне – дзе яно?
Зноў вясна, і жаль знікае зноў.
(Так губляюць пах перад вясной
Ссохлыя сцяблiны палыноў.)
Ціха цмокае у сне рака.
О, як добра, як прыгожа жыць!
Раска, як русалчына луска,
На вадзе ад месяца гарыць.
А вакол травіцы роснай рай
І бярозак белая сям'я.
Мой чароўны беларускі край,
Бацькаўшчына светлая мая!
1956

*Шыфр удзельніка*

_______________

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Намеснік старшыні
абласнога арганізацыйнага камітэта
Рэспубліканскай алімпіяды,
першы намеснік
начальніка ўпраўлення адукацыі
Віцебскага аблвыканкама

Л.М.Сцяпанаў

”05“ лістапада 2015 года

# Комплексная работа па беларускай мове і літаратуры

# IX клас

| **Заданні** | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | Усяго |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **Балы** | | | | | | | | | | | |

**Заданне 1.** Якімі літарамі можа быць абазначаны гук **[ч]**? Прывядзіце прыклады.

*За кожны правільны адказ – **0,5 бала**.*

______________________________________________________________________
______________________________________________________________________
______________________________________________________________________
______________________________________________________________________
______________________________________________________________________

**Заданне 2.** Устаўце, дзе патрэбна, прапушчаныя літары і знакі прыпынку, раскрыйце дужкі, афармляючы тэкст у адпаведнасці з арфаграфічнымі і пунктуацыйнымі нормамі. Словы, пададзеныя ў дужках, запішыце ў патрэбнай форме.

*Максімальная колькасць балаў – **9**.*

Ён быў Падарожнік з вялікай літары.

Ён валодаў тал..нтам падарожжа. (Н..) воднага (н..) ведаю хто мог бы параўн..цца з ім у гэтым (талент)_________________ .

Ён (н..) сц..раў белыя плямы на геаграфічных картах. Ён стараўся каб (н..) был.. белых плямаў у нашай памяці і свядомасці. Ім кіравала натхнён..асць якая вырасла з самай вялікай любові з любові да народ.. да роднае зямлі.

Ён любіў паляванне ўмеў спрытна закінуць вуду – праўда пазней ён адмовіўся ад гэтых мужчынскіх забаў: (н..) мог ні..чыць жывое, – а вогнішча распал..ваў з вірту..знасц..ю заўзятага турыста.

Ды куды тым турыстам... Ніколі ён (н..) падарожнічаў каб наматляць на спідометр р..кордныя кіл..метры, дз..ля забавы скарыць горную вяршыню здз..віцца (н..) звыкламу краявіду. Ён узб..раўся на Крымскія горы вандраваў па (Далёкі Усход)_____________________________ , выходзіў у Чорнае мора лавіць кефаль блукаў па старажытны.. расійскі.. гарада.. (сам) на (сам) быў з Бухарой і Самаркандам.

Але галоўным яго падарожжам праз усё жыццё было вандраванне па Беларусі. Родныя шляхі і сцяжыны вывучаў падрабязна грунтоўна. Ён хадзіў і ездзіў па іх р..гулярна і (н.) натольна (н..) ведаючы стомы. Чаму і стаў такім.

**Заданне 3.** Фразеалагізмам, якія маюць значэнне *'гаварыць глупства, пустасловіць'*, падбярыце належны дзеяслоў з правага слупка. Адказ запішыце адпаведнай літарай.

*Максімальная колькасць балаў* – **5**.

| | |
|---|---|
| 1) … не падсяваючы | а) разводзіць |
| 2) блынды … | б) гарадзіць |
| 3) … у разбіты лапаць | в) круціць |
| 4) … антымоніі | г) араць |
| 5) … вала за хвост | д) званіць |
| 6) … кашалі з лапцямі | е) малоць |
| 7) … з пустога ў парожняе | ё) таўчы |
| 8) … ваду ў ступе | ж) правіць |
| 9) … дарогі | з) пераліваць |
| 10) … плот | і) плесці |

Адказ: 1)_____2)_____3)_____4)_____5)_____6)_____7)_____8)_____9)_____10)_____

**Заданне 4.** Утварыце непасрэдна ад дадзеных слоў прыслоўі. Пазначце спосаб іх утварэння.

*Максімальная колькасць балаў* – **6**.

| | Прыслоўе | Спосаб утварэння |
|---|---|---|
| паваліць | | |
| свой | | |
| летась | | |
| дзве | | |
| завочны | | |
| канец | | |

**Заданне 5.** Дзеясловы, прапанаваныя ў заданні 3, запішыце ў форме 2-й асобы множнага ліку абвеснага ладу.

*Максімальная колькасць балаў* – **5**.

______________________________________________________________________________
______________________________________________________________________________
______________________________________________________________________________
______________________________________________________________________________
______________________________________________________________________________
______________________________________________________________________________

**Заданне 6.** Словазлучэнні, прыведзеныя ў множным ліку, пастаўце ў форме адзіночнага ліку.

*Максімальная колькасць балаў – **4**.*

| Множны лік | Адзіночны лік |
|---|---|
| афрыканскія жырафы | |
| скураныя туфлі | |
| шэрыя вараняняты | |
| звонкія капы́ты | |
| вузкія швы | |
| вясёлыя гусі | |
| абрыдлыя блохі | |
| пругкія рамяні | |

**Заданне 7.** Складзіце сказы з дзеясловам ***вучыцца*** ў форме інфінітыва так, каб дадзены дзеяслоў выконваў розныя сінтаксічныя функцыі.

*За кожны правільна складзены прыклад – **1 бал**.*

______________________________________________________________________

______________________________________________________________________

______________________________________________________________________

______________________________________________________________________

______________________________________________________________________

______________________________________________________________________

______________________________________________________________________

**Заданне 8.** Пра каго ідзе размова ў тэксце задання 2? Назавіце гэтага беларускага пісьменніка.

Запішыце, як называлася яго кніга нарысаў, у якой пісьменнік годна і з адданай любоўю ўславіў родную Беларусь. Для якога чытача была напісана гэта кніга?

*Максімальная колькасць балаў – **3**.*

______________________________________________________________________

______________________________________________________________________

______________________________________________________________________

______________________________________________________________________

**Заданне 9.** Знайдзіце запазычанае слова па яго лексічным значэнні і запішыце па-беларуску.

*Максімальная колькасць балаў – **5**.*

1. Вострае пытанне, якое патрабуе вырашэння (*идея, проблема, пафос*).

______________________________________________________________________

2. Мастацкае азначэнне, якое вобразна характарызуе прадмет, з’яву або чалавека (*сравнение, метафора, эпитет*).

______________________________________________________________________

3. Апавядальны твор фальклору, прысвечаны жыццю рэальных асоб і гістарычных падзей, заснаваны пераважна на сапраўдных гісторыях або тых, якія верагодна маглі быць (*предание, баллада, легенда*).______________________________________________________

______________________________________________________________________

4. Аднолькавая сінтаксічная будова суседніх сказаў або ўрыўкаў (*асиндетон, параллелизм, рефрен*).

______________________________________________________________________

5. Слова, фраза, тэкст, які аднолькава чытаецца злева направа і справа налева (*метаграмма, анаграмма, палиндром*).

______________________________________________________________________

**Заданне 10.** Пазнайце вядомыя творы па зрыфмаваных словах першых радкоў. Запішыце аўтара і назву твора.

*Максімальная колькасць балаў – **3**.*

1) сінім – дзяўчыне, гаю – кахаю;

---

2) вякоў – спадчына, чужакоў – матчынай;

---

3) коле – поле, парсюк – усю.

---

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Намеснік старшыні
абласнога арганізацыйнага камітэта
Рэспубліканскай алімпіяды,
першы намеснік
начальніка ўпраўлення адукацыі
Віцебскага аблвыканкама

Л.М.Сцяпанаў

”05“ лістапада 2015 года

# Тэмы вусных выказванняў

## IX клас

### Білет 1

1. Ты – боль, паэзія. Ты – бой.
   Ты – праўда непрыступнай вежы.
   *Леанід Галубовіч*

2. Магутнае слова ты, роднае слова!
   *Янка Купала*

### Білет 2

1. Літаратурны твор, які мяне ўразіў.

2. Кахаю… люблю…
   Беларускаму краю
   Бясконца я слова «люблю» паўтараю.
   *Данута Бічэль*

### Білет 3

1. Усё мае свой працяг жыцця,
   Апроч няпраўды.
   *Максім Танк*

2. Трэба дома бываць часцей…
   *Рыгор Барадулін*

### Білет 4

1. Але памяць аб музыку не згінула з ім разам…
   *Максім Багдановіч*

2. А мова матчына пявучая!
   Густая, нібы мёд, іскрыстая, як сонца!
   *Эдуард Валасевіч*

## Білет 5

1. Сілен, княжа, караць, галаву сілен зняць, –
   Не скуеш толькі дум ланцугамі.

   *Янка Купала*

2. Прапрадзедаў маіх жывая мова –
   Майго народа першая аснова,
   Душы яго шырокі, чысты свет!

   *Еўдакія Лось*

## Білет 6

1. У нашым класе, у нашай школе ёсць такія традыцыі…

2. Ад прадзедаў спакон вякоў
   Мне засталася спадчына...

   *Янка Купала*

## Білет 7

1. Купала і Колас, вы нас гадавалі…

   *Пятрусь Броўка*

2. 21 лютага адзначаецца Міжнародны дзень роднай мовы.

## Білет 8

1. Бо як ёсць у народа такія –
   Не загіне давеку народ.

   *Уладзімір Караткевіч*

2. Самы светлы талент – дабрата.

   *Сяргей Грахоўскі*

## Білет 9

1. Мая любімая казка.

2. Колькі вызнаў і вынес ты, краю мой мілы!

   *Генадзь Бураўкін*

## Білет 10

1. Архітэктурныя помнікі Беларусі.

2. Мова – душа народа.

## Білет 11

1. Я родам з Адраджэння. Ды цяпер
   Усім часам, прасторам я належу.

   *Мікола Арочка*

2. Люблю цябе і слухаю, прырода, такая блізкая парой любой!

   *Васіль Жуковіч*

## Білет 12

1. Музыка ў маім жыцці.

2. Вочы маці!
   У доўгія зімнія ночы
   Вы над намі
   Вясёлымі зоркамі ззялі…

   *Ніл Гілевіч*

## Білет 13

1. Святлана Алексіевіч — першы нобелеўскі лаўрэат з Беларусі…

2. Веды і дабрачыннасць як свечка, што асвятляе чалавеку шлях і не дае заблукаць.

   *Сымон Будны*

## Білет 14

1. Родны мой горад. (Родная мая вёска.)

2. Бедны той, хто не мае скарбаў вечных – скарбаў душы.

   *Цётка*

## Білет 15

1. Біблія – дзівосная рака…

   *Францішак Скарына*

2. Чалавек – гэта цэлы свет.

   *Кузьма Чорны*

## Білет 16

1. Мае бацькі – мае настаўнікі ў жыцці.

2. Песня – душа народа.

   *Рыгор Шырма*

## Білет 17

1. Мінулае вучыць нас, як жыць сёння.

   *Ян Баршчэўскі*

2. Прырода – найцікавейшая кніга.

   *Якуб Колас*

## Білет 18

1. Свет нас прымаў як народ
   Па адной палачанцы.

   *Данута Бічэль*

2. Чалавеку патрэбна не слава…

   *Сяргей Грахоўскі*

## Білет 19

1. Там, дзе я жыву, варта паставіць помнік…

2. Жыццё даецца, каб жыццё тварыць…

*Анатоль Вярцінскі*

## Білет 20

1. Унукі Скарыны,
   Дзе ваш гонар, моц і краса?
   Ёсць і ў вас, як і ў іншых, святыня.
   Не давайце святыні псам!

*Уладзімір Караткевіч*

2. Нема крычала матчына сэрца ад нясцерпнае раны вайны.

*Васіль Быкаў*

УПРАЎЛЕННЕ АДУКАЦЫІ ВІЦЕБСКАГА АБЛВЫКАНКАМА

# **М а т э р ы я л ы**

**другога этапу (раённы, гарадскі) Рэспубліканскай алімпіяды**
**<u>па беларускай мове і літаратуры</u>**
**для вучняў X класа ўстаноў адукацыі**
**Віцебскай вобласці**
**(2015/2016 навучальны год)**

ВІЦЕБСК · 2015

Другі этап (раённы, гарадскі) Рэспубліканскай алімпіяды праводзіцца ў 3 туры (два – у пісьмовай форме і адзін – у вуснай) па асобных заданнях для IX, X, XI класаў. Працягласць тураў для ўсіх класаў складае 6 гадзін: напісанне водгуку – не больш за 2,5 гадзіны; комплексная работа па беларускай мове і літаратуры – не больш за 2 гадзіны; вуснае выказванне – на падрыхтоўку кожнаму ўдзельніку да 20 хвілін, на адказ – да 5-7 хвілін.

Удзельнікам другога этапу ва ўсіх класах для вуснага выказвання прапануюцца білеты, у склад якіх уваходзяць дзве тэмы. Удзельнік выцягвае білет і выбірае адну з дзвюх прапанаваных тэм.

Комплексная работа па беларускай мове і літаратуры выконваецца на аркушах, дзе змешчаны заданні. Перад пачаткам правядзення комплекснай работы па беларускай мове і літаратуры, а потым перад водгукам запаўняюцца бланкі асабістых картак, на якіх змяшчаецца шыфр удзельніка.

**Пры выкананні заданняў комплекснай работы па беларускай мове і літаратуры за кожную дапушчаную памылку здымаецца 0,2 бала.**

<u>Падчас ацэнкі водгуку і вуснага выказвання карыстацца строга крытэрыямі, якія дадаюцца.</u>

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Намеснік старшыні
абласнога арганізацыйнага камітэта
Рэспубліканскай алімпіяды,
першы намеснік
начальніка ўпраўлення адукацыі
Віцебскага аблвыканкама

Л.М.Сцяпанаў

”05“ лістапада 2015 года

# Водгук на мастацкі твор

## X клас

Уладзімір Караткевіч

***

У векавечнай Бацькаўшчыне клёны
Нячутна пачынаюць аблятаць
На рыжую траву, на мох зялёны,
На весніцы,
На ціхі стаў, на гаць.
Зямля глядзіць азёрамі-вачыма
На ясны свет, што стыне у красе.
Як чыста, бы святло абшары вымыла,
Як ціха – быццам зніклі людзі ўсе.
Адвечная мая! Ў сцюдзёных росах,
Як летась, як мільёны год таму...
Ляцяць на ветры косы рыжай восені,
І кліча лісця жоўты сум зіму.
На вуснах стыне горкі смак рабіны,
Цалую іх, халодныя як лёд.
О вы, што будзеце ісці з дзяўчынай
Пад тымі ж клёнамі праз сотню год,
Ці зразумееце, што мы кахалі,
Што зніклі так, як знікнеце і вы,
Што векавечны толькі край, і далеч,
І жоўты ліст на зелені травы,
Што ў векавечнай Бацькаўшчыне клёны
Тысячагоддзі будуць аблятаць
На рыжую траву, на мох зялёны,
На весніцы, на ціхі стаў, на гаць,
Што нездарма яна з асінак рудых,
Калі ідзеш увосень па зямлі,
Раняе золата пад ногі людзям,
Каб мы яе любілі й берaглі.
1957

*Другі этап (раённы, гарадскі) Рэспубліканскай алімпіяды*
*по беларускай мове і літаратуры*

*Шыфр удзельніка*

_______________

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Намеснік старшыні
абласнога арганізацыйнага камітэта
Рэспубліканскай алімпіяды,
першы намеснік
начальніка ўпраўлення адукацыі
Віцебскага аблвыканкама

Л.М.Сцяпанаў

”05“ лістапада 2015 года

# Комплексная работа па беларускай мове і літаратуры

## X клас

| **Заданні** | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | Усяго |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **Балы** | | | | | | | | | | | |

**Заданне 1.** Якія розныя гукі можа абазначаць літара **і**? Адказ праілюструйце прыкладамі.

*За кожны правільны адказ –* ***0,5 бала****.*

______________________________________________________________________
______________________________________________________________________
______________________________________________________________________
______________________________________________________________________
______________________________________________________________________
______________________________________________________________________
______________________________________________________________________
______________________________________________________________________
______________________________________________________________________
______________________________________________________________________

**Заданне 2.** Устаўце, дзе патрэбна, прапушчаныя літары і знакі прыпынку, раскрыйце дужкі, афармляючы тэкст у адпаведнасці з арфаграфічнымі і пунктуацыйнымі нормамі. Лічбы пазначце словамі. Словы, пададзеныя ў дужках, запішыце ў патрэбнай форме.

*Максімальная колькасць балаў –* ***10****.*

Моцныя і цёплыя сувязі ядналі піс..менніка (з)____ старэйшай с..строй Наталл..й. У верш.. напісан..ым 20 лістапад.. 1982 года ______________________________________________________________ ________________________________________ да яе 60-годдзя ______________________________________ , брат зыч..ў сястр.. і яе сям'.. ўсяго самага найлепшага ў жыцці называў яе сва..й дарагой нян..кай сва..й абаронцай у бядзе марыў пра т..й час калі яны абое некалі сядуць на прызбу і згадаюць пражытыя г..ды ўспомняць Оршу, «*тую, зялёную, бег крыніц ля Дняпра-ракі, і ўральскія эшалоны, і ў цяплушках салдатаў палкі*». У брата і с..стры было ..часлівае (да) ваеннае дзяцінства. Потым пры..шлі суровыя выпрабаванні ваеннага час.. а пасля радасці і турботы мірнага жыцця.

Ч..сцейшымі сталі сустрэчы брата і сястры пасля таго як у 1971 годзе ________________
______________________________________________________________________

Наталля С..мёнаўна пераехала з сям'ёй на сталае жыхарства ў Мінск. ..чырай дара..чыцай і памочніцай была яна для піс..менніка ў апошнія г..ды ягонага жыцця асабліва калі (н..) стала братавай (жонка) ___________ .

*Знайдзіце ў тэксце граматычную памылку ва ўжыванні прыметніка. Выправіўшы памылку, запішыце і патлумачце яе.*

______________________________________________________________________

______________________________________________________________________

______________________________________________________________________

**Заданне 3.** Запішыце дадзеныя запазычаныя словы па-беларуску.

*Максімальная колькасць балаў – **5**.*

| | | |
|---|---|---|
| alma mater | лацінскі выраз са значэннем "старадаўняя студэнцкая назва ўніверсітэта" | |
| attraction | французскае слова са значэннем "эфектны нумар цыркавой або эстраднай праграмы; назва забаў у месцах гулянняў" | |
| belles-lettres | французскае слова са значэннем "творы для лёгкага чытання" | |
| großmeister | нямецкае слова са значэннем "найвышэйшае спартыўнае званне ў шахматах і шашках" | |
| mayonnaise | французскае слова са значэннем "халодны соус з алею, яечнага жаўтка, воцату і іншых заправаў" | |
| impresario | італьянскае слова са значэннем "арганізатар відовішчаў ці агент артыста" | |
| assessor | лацінскае слова са значэннем "службовая асоба, надзеленая судовай уладай" | |
| know-how | англійскае слова са значэннем "арыгінальныя тэхналогіі, веды, уменні, якія яшчэ не сталі шырока вядомыя" | |
| abbreviatura | італьянскае слова са значэннем "слова, утворанае з пачатковых гукаў або літар слоў, што ўваходзяць у пэўнае словазлучэнне" | |
| resume | французскае слова са значэннем "дакумент, які змяшчае інфармацыю пра чалавека – кандыдата на працу" | |

**Заданне 4.** На кожны спосаб утварэння прывядзіце свой прыклад.

*Максімальная колькасць балаў – **4**.*

Адвербіялізацыя – пераход іншых часцін мовы ў прыслоўі.

______________________________________________________________________

______________________________________________________________________

Ад'ектывацыя – пераход іншых часцін мовы ў прыметнікі.

______________________________________________________________________

______________________________________________________________________

Пранаміналізацыя – пераход іншых часцін мовы ў займеннікі.

Субстантывацыя – пераход іншых часцін мовы ў назоўнікі.

**Заданне 5.** Да кожнага з фразеалагізмаў падбярыце слова-антонім.

*Максімальная колькасць балаў – **4**.*

| Фразеалагізм | Слова-антонім |
|---|---|
| У кожнай кішэні па жмені | |
| Хоць сабак вешай | |
| Выводзіць на белы свет | |
| Глядзець знізу ўверх | |
| Дзе Макар козы пасвіць | |
| Без цара ў галаве | |
| Грэць лоб | |
| Хоць на сабаку выллі | |

**Заданне 6.** Назавіце разрад лічэбніка *абое*, узятага з тэксту задання 2. Пісьмова праскланяйце яго і патлумачце асаблівасць ужывання.

*Максімальная колькасць балаў – **3**.*

**Заданне 7.** Параўнайце прапанаваныя ў дужках дзеяслоўныя формы і запішыце варыянт, адпаведны літаратурнай норме.

*Максімальная колькасць балаў – **5**.*

| | |
|---|---|
| Высеяць (высеяце, высеece, высеіце) | |
| Сыпаць (сыплюць, сыпяць, сыпюць) | |
| Гусці (гудзіць, гусе, гудзе) | |
| Малоць (мялю, малю, малачу) | |
| Сцерці (сцераце, сатроце, сатраце) | |
| Засячы (засякеш, засячэш, засячош) | |

| | |
|---|---|
| Адпачыць (адпачываем, адпачым, адпачнём) | |
| Свішчуць (свістаць, свісцець, свіснуць) | |
| Угледзець (угледзіў, углядзеў, угледзеў) | |
| Гаварыць (гаворылі, гаварылі, гаворілі) | |

**Заданне 8.** Назавіце беларускага пісьменніка, пра якога ідзе размова ў тэксце задання 2.

Дзень смерці пісьменніка 25 ліпеня супаў з днём нараджэння маці, якую сын вельмі моцна любіў і шанаваў і прысвяціў ёй свае галоўныя творы. Запішыце, якія творы гэты пісьменнік прысвяціў маме.

*Максімальная колькасць балаў* – ***3***.

______________________________________________

______________________________________________

______________________________________________

**Заданне 9.** Знайдзіце запазычанае слова па яго лексічным значэнні і запішыце па-беларуску.

*Максімальная колькасць балаў* – ***5***.

1. Верш, у якім пачатковыя літары радкоў утвараюць слова ці фразу (*акростих, буриме, шарада*).

______________________

2. Спалучэнне слоў з супрацьлеглым значэннем, якія лагічна выключаюць адно другое, але, ужытыя разам, даюць новае паэтычнае ўяўленне (*оксюморон, аллегория, перифраза*).

______________________

3. Васьмірадковы верш, у якім два першыя і два апошнія, а таксама першы і чацвёрты радкі аднолькавыя (*рондо, триолет, сонет*).

______________________

4. Трохскладовая стапа з націскам на першым складзе (*дактиль, хорей, анапест*).

______________________

5. Паўтор аднолькавых або падобных зычных гукаў (*ассонанс, звукопись, аллитерация*).

______________________

**Заданне 10.** У многіх літаратурных творах апісваюцца гістарычныя падзеі, знаходзяць адлюстраванне гістарычныя факты. Запоўніце прабелы ў табліцы, указаўшы ці гістарычную падзею, ці назву твора, ці імя аўтара.

*Максімальная колькасць балаў* – ***5***.

| Гістарычная падзея, факт | Аўтар | Твор |
|---|---|---|
| | Уладзімір Караткевіч | “Паром на бурнай рацэ” |
| Другая сусветная вайна | | “Незагойная рана” |
| | | “Пісьмо з-пад шыбеніцы” |
| | Максім Гарэцкі | |
| | | “Жураўліны крык” |
| | Іван Пташнікаў | “Ільвы” |
| Другая сусветная вайна | | “Лісце каштанаў” |

*Другі этап (раённы, гарадскі) Рэспубліканскай алімпіяды*
***<u>па беларускай мове і літаратуры</u>***

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Намеснік старшыні
абласнога арганізацыйнага камітэта
Рэспубліканскай алімпіяды,
першы намеснік
начальніка ўпраўлення адукацыі
Віцебскага аблвыканкама

Л.М.Сцяпанаў

”05“ лістапада 2015 года

# Тэмы вусных выказванняў

## X клас

### Білет 1

1. Але памяць аб музыку не згінула з ім разам…

   *Максім Багдановіч*

2. Нема крычала матчына сэрца ад нясцерпнае раны вайны.

   *Васіль Быкаў*

### Білет 2

1. Святлана Алексіевіч – нобелеўскі лаўрэат: «за свае паліфанічныя творы, помнік пакутам і мужнасці нашага часу».

2. Бедны той, хто не мае скарбаў вечных – скарбаў душы.

   *Цётка*

### Білет 3

1. Усё мае свой працяг жыцця,
   Апроч няпраўды.

   *Максім Танк*

2. Я люблю гэтыя прасторы, люблю неаглядныя ружова-сінія далі…

   *Якуб Колас*

### Білет 4

1. Ты – боль, паэзія. Ты – бой.
   Ты – праўда непрыступнай вежы.

   *Леанід Галубовіч*

2. Прапрадзедаў маіх жывая мова –
   Майго народа першая аснова,
   Душы яго шырокі, чысты свет!

   *Еўдакія Лось*

## Білет 5

1. Купала і Колас, вы нас гадавалі…

   *Пятрусь Броўка*

2. Колькі вызнаў і вынес ты, краю мой мілы!

   *Генадзь Бураўкін*

## Білет 6

1. Жыццём сваім, справай і смерцю вялікі – Кастусь Каліноўскі.

   *Уладзімір Караткевіч*

2. 21 лютага адзначаецца Міжнародны дзень роднай мовы.

## Білет 7

1. Родны мой горад. (Родная мая вёска.)

2. Сілен, княжа, караць, галаву сілен зняць, –
   Не скуеш толькі дум ланцугамі.

   *Янка Купала*

## Білет 8

1. Бо як ёсць у народа такія –
   Не загіне давеку народ.

   *Уладзімір Караткевіч*

2. З легендаў і казак былых пакаленняў…

   *Максім Танк*

## Білет 9

1. Песня – душа народа.

2. О Беларусь, мая шыпшына!
   Зялёны ліст, чырвоны цвет…

   *Уладзімір Дубоўка*

## Білет 10

1. Нязгасная зорка паэзіі нашай – Максім Багдановіч.

   *Алесь Бачыла*

2. Не дай мне Бог духоўным стаць бадзягам,
   Без памяці жывой, без каранёў…

   *Васіль Зуёнак*

## Білет 11

1. Унукі Скарыны,
   Дзе ваш гонар, моц і краса?
   Ёсць і ў вас, як і ў іншых, святыня.
   Не давайце святыні псам!

   *Уладзімір Караткевіч*

2. Веды і дабрачыннасць як свечка, што асвятляе чалавеку шлях і не дае заблукаць.

   *Сымон Будны*

## Білет 12

1. У нашым класе, у нашай школе ёсць такія традыцыі…

2. Люблю цябе і слухаю, прырода, такая блізкая парой любой!

*Васіль Жуковіч*

## Білет 13

1. Музыка ў маім жыцці.

2. Чалавек – гэта цэлы свет.

*Кузьма Чорны*

## Білет 14

1. Мінулае вучыць нас, як жыць сёння.

*Ян Баршчэўскі*

2. Магутнае слова ты, роднае слова!

*Янка Купала*

## Білет 15

1. Літаратурны твор, які мяне ўразіў.

2. Збіраўся скарб, струменіўся няспынна,
   Вясёлкавым ірдзеннем мне спяваў…

*Якуб Колас*

## Білет 16

1. Свет нас прымаў як народ
   Па адной палачанцы.

*Данута Бічэль*

2. Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі.

*Францішак Багушэвіч*

## Білет 17

1. Беларускія тытаны эпохі Адраджэння.

2. Прырода – найцікавейшая кніга.

*Якуб Колас*

## Білет 18

1. Там, дзе я жыву, варта паставіць помнік…

2. Мова – душа народа.

## Білет 19

1. Біблія – дзівосная рака…

*Францішак Скарына*

2. Жыццё даецца, каб жыццё тварыць…

*Анатоль Вярцінскі*

# Білет 20

1. Архітэктурныя помнікі Беларусі.

2. Чалавеку патрэбна не слава…

   *Сяргей Грахоўскі*

УПРАЎЛЕННЕ АДУКАЦЫІ ВІЦЕБСКАГА АБЛВЫКАНКАМА

# **М а т э р ы я л ы**
**другога этапу (раённы, гарадскі) Рэспубліканскай алімпіяды**
**<u>па беларускай мове і літаратуры</u>**
**для вучняў ХІ класа ўстаноў адукацыі**
**Віцебскай вобласці**
**(2015/2016 навучальны год)**

ВІЦЕБСК · 2015

Другі этап (раённы, гарадскі) Рэспубліканскай алімпіяды праводзіцца ў 3 туры (два – у пісьмовай форме і адзін – у вуснай) па асобных заданнях для IX, X, XI класаў. Працягласць тураў для ўсіх класаў складае 6 гадзін: напісанне водгуку – не больш за 2,5 гадзіны; комплексная работа па беларускай мове і літаратуры – не больш за 2 гадзіны; вуснае выказванне – на падрыхтоўку кожнаму ўдзельніку да 20 хвілін, на адказ – да 5-7 хвілін.

Удзельнікам другога этапу ва ўсіх класах для вуснага выказвання прапануюцца білеты, у склад якіх уваходзяць дзве тэмы. Удзельнік выцягвае білет і выбірае адну з дзвюх прапанаваных тэм.

Комплексная работа па беларускай мове і літаратуры выконваецца на аркушах, дзе змешчаны заданні. Перад пачаткам правядзення комплекснай работы па беларускай мове і літаратуры, а потым перад водгукам запаўняюцца бланкі асабістых картак, на якіх змяшчаецца шыфр удзельніка.

**Пры выкананні заданняў комплекснай работы па беларускай мове і літаратуры за кожную дапушчаную памылку здымаецца 0,2 бала.**

<u>Падчас ацэнкі водгуку і вуснага выказвання карыстацца строга крытэрыямі, якія дадаюцца.</u>

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Намеснік старшыні
абласнога арганізацыйнага камітэта
Рэспубліканскай алімпіяды,
першы намеснік
начальніка ўпраўлення адукацыі
Віцебскага аблвыканкама

Л.М.Сцяпанаў

”05“ лістапада 2015 года

# Водгук на мастацкі твор
## XI клас

Уладзімір Караткевіч

Нявесце Каліноўскага

Недзе поруч ляжалі дарогі,
Кліч кахання ляцеў ад ніў,
Але ён не кахаў нікога,
Бо занадта радзіму любіў.
Варты лепшага ў свеце кахання,
Рана скончыўшы мужны палёт,
Русы хлопец золкім світаннем
На высокі ўзышоў эшафот.
Плач людскі барабаны крыюць,
І ад пошчаку глухне зямля.
На высокую гордую шыю
Успаўзае змяёю пятля.
З плачам жоравы пралятаюць.
Курганы і магільны жвір,
Непалітая ніва святая,
Плач жанчын, эшафот і Сібір.
Нікні гожаю галавою,
Па нязнанай страце ўздыхай.
Дарагая, ты стала ўдавою,
Не пабачыўшы жаніха.
Вашы кветкі ў лугах завялі,
Месяц марна згарэў над ракой,
Ты чакала яго, а стала
І нявестай, і жонкай чужой.
І чамусьці ў сэрцы, як рану,
Я нясу твой нязбытны лёс,
Не даруючы ўсім тыранам
Непралітых табою слёз.

1960

*Другі этап (раённы, гарадскі) Рэспубліканскай алімпіяды*
*па беларускай мове і літаратуры*

*Шыфр удзельніка*

_______________

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Намеснік старшыні
абласнога арганізацыйнага камітэта
Рэспубліканскай алімпіяды,
першы намеснік
начальніка ўпраўлення адукацыі
Віцебскага аблвыканкама
Л.М.Сцяпанаў

”05“ лістапада 2015 года

# Комплексная работа па беларускай мове і літаратуры

# XI клас

| **Заданні** | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | Усяго |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **Балы** | | | | | | | | | | | |

**Заданне 1.** Узнавіце выказванні, запоўніўшы пропускі. Прывядзіце па адным прыкладзе на кожнае спалучэнне зычных.

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*

1. Спалучэнні зычных **зч, жч** вымаўляюцца як [ … ], напрыклад:
   **зч** ___________________________ ,
   **жч** ___________________________ .
2. Спалучэнні зычных **шс, жс** вымаўляюцца як [ … ], напрыклад:
   **шс** ___________________________ ,
   **жс** ___________________________ .
3. Спалучэнні зычных **дч, тч** вымаўляюцца як [ … ], напрыклад:
   **дч** ___________________________ ,
   **тч** ___________________________ .
4. Спалучэнні зычных **тц, чц** вымаўляюцца як [ … ], напрыклад:
   **тц** ___________________________ ,
   **чц** ___________________________ .

**Заданне 2.** У першых васьмі абзацах устаўце, дзе патрэбна, прапушчаныя літары і знакі прыпынку, афармляючы тэкст у адпаведнасці з арфаграфічнымі і пунктуацыйнымі нормамі. Дапішыце ў дужках прапушчаныя назвы твораў.

*Максімальная колькасць балаў – **8**.*

Ён пры..шоў прыгадаць і паказаць Беларусь ра..павесці пра яе.

Гэта, насамрэч, была яго Беларусь але яна паступова ўваходзіла ў нашу душу станавілас.. так (сама) і нашай Беларус..ю. Як нашымі сябрамі, праваднікамі па сваёй земл.. станавіліс.. і «дзеці» піс..менніка, героі яго твораў...

Мы разам з Раманам Ракутовічам няскоран..ым і абязручан..ым пя..чотна абдымаем акрываўлен..ымі цурбалкамі каханую пазбаўлен..ую зрок.. Ірыну — сваю родную зямлю («С..вая легенда»).

Мы разам з Андрэ..м Беларэцкім знаходзім паратунак ад цёмных, вераломных сіл для запужан..ай і амаль пазбаўлен..ай надзеі на далейшае існаванне Надзеі Яноўскай — сваёй роднай зямлі (__________________________________________________ ).

Мы разам з Гервасі..м Выліваха.. блукаем па царств.. Аіда і гуляем са Смерц..ю ў шахматы а нам дапамагае незгасальнае святло шыпшыны і прамяністы позірк Бярозкі — сімвалаў сваёй роднай зямлі (________________________________ ).

Мы разам з Андрэ..м Рогачам праз пакуты і выпрабаванні вяртаем да жыцця сваю д..ябальскую душу знаходзячы страчваючы і зноў адшукваючы Дубраўку — сваю родную зямлю («Легенда аб бедным д'ябле і аб адвакатах Сатаны...»).

Мы разам з Васілём Ветрам накіроўваемся ў пячору да пракажон..ага каб усвядоміць адказнасць перад Чалавекам перад сваёй роднай маці-зямлёй («Маці ўраган..»).

Мы разам з Юрасём Братчыкам пачынаем разумець што дз..ля праўды павінны быць усвядомлен..ыя перакананн..і і моцная воля што, (у) рэшце рэшт, урабляць ніву даваць ёй магчымасць радзіць – гэта і ёсць найвышэйшае прызначэнне Чалавека на роднай зямлі («Хрыстос прызямліўся ў Гародні»).

Мы разам з Петраком Ясюкевічам, прыносячы шчасце іншым народам, ратуючы ў пясках Сахары маленькі камячок жывой плоці, Джамілю, марым вярнуцца да сваёй пакрыўджанай, здратаванай і акрываўленай, але ўсё ж самай прыгожай роднай зямлі («Сіняя-сіняя...»).

Мы разам з Алесем Загорскім і Кастусём Каліноўскім бачым «на кожным раздарожжы, над усёй краінай узлёт прабітых цвікамі рук» і змагаемся за праўду і справядлівасць, перакананыя, што «не трэба тысячы, каб пачаць» здабываць волю для сваёй роднай зямлі (______________________________________________ ).

Мы разам з Севярынам Будрысам знаходзім сваю чазенію — Гражыну Арсайлу, сімвал гармоніі, і страчваем яе, і ўсё ж спадзяёмся на блізкую сустрэчу з ёй — сваёй вялікай зямлёй, радзімай чалавецтва (______________________________ ).

Мы разам з Антонам Космічам набліжаемся да разумення таго, што без радзімы мы нічога не варты: «*Край мой! Родная мая зямля! Як жа мне жыць, калі я пайду з цябе? Як мне быць, калі я памру і, можа, быццё маё яшчэ некаторы час не скончыцца – і гэта й ёсць абяцанае мне пекла? Без цябе*» («Чорны замак Альшанскі»).

**Заданне 3.** Фразеалагізмы многае могуць распавесці пра чалавека і яго характар. Запішыце чалавечыя якасці, якія называюць наступныя фразеалагізмы.

*Максімальная колькасць балаў – **3**.*

| Фразеалагізмы | Якасці чалавека |
|---|---|
| гарачая галава | |
| дзіравая галава | |
| галава на плячах | |
| сам сабе галава | |
| з ветрам у галаве | |
| хоць кол на галаве чашы | |

**Заданне 4.** Знайдзіце аўтарскія неалагізмы і, паставіўшы ў пачатковую форму, запішыце іх у табліцу. Пазначце, ад якіх слоў яны ўтварыліся і якім спосабам.

*За кожны правільны адказ–* ***0,5 балаў.***

1. *Паняньквала за свой век нямала*. (Ніна Мацяш. Паняньквала за свой век нямала…)
2. *Годзе загоны сабой харашыць!* (Янка Купала. Жніво)
3. *Блукаюць грыбазбіры, якоча рэхам лес.* (Пімен Панчанка. Мінск едзе па грыбы)
4. *Род праходзіць, і прыходзіць род, а зямля трываліцца навекі*. (Рыгор Барадулін. Род праходзіць…)

| Неалагізмы | Ад якіх слоў утварыліся | Спосаб утварэння |
|---|---|---|
| | | |
| | | |
| | | |
| | | |
| | | |
| | | |

**Заданне 5.** Знайдзіце і запішыце з тэксту задання 2 беларускія адпаведнікі прыведзеным рускім словам. Назавіце часціну мовы.

*Максімальная колькасць балаў –* ***5.***

| | Беларускі адпаведнік з тэксту | Часціна мовы |
|---|---|---|
| осознанный | | |
| почти | | |
| шиповник | | |
| спасая | | |
| ради | | |

**Заданне 6.** Ад дадзеных назоўнікаў утварыце, дзе мажліва, форму роднага склону множнага ліку і запішыце.

*Максімальная колькасць балаў –* ***5.***

Мальба, конь, бервяно, чарніла, госця, зяць, рунь, брыво, прыцемак, грошы.

______________________________________________________________________

______________________________________________________________________

______________________________________________________________________

**Заданне 7.** Запішыце, якім членам сказа з’яўляецца злучальнае слова **які** ў дадзеных частках складаназалежных сказаў.

*Максімальная колькасць балаў –* ***4.***

| | Член сказа |
|---|---|
| 1. Паважна і ўрачыста кланяліся рэдкія бярозы і дубы, на якіх дзе-нідзе завісала пад цяжарам снегу карычневае лісце. | |
| 2. Мне, якому пайшоў ужо шосты дзясятак, прыемна з маладымі гаварыць. | |
| 3. Ён не той, якім умее прыкідвацца. | |

| | |
|---|---|
| 4. Клімат і расліннасць, якія ўласцівы Беларусі ў сучасныя дні, усталяваліся тут каля дваццаці тысяч гадоў назад. | |

**Заданне 8.** Чые персанажы і творы ўзгадваюцца ў тэксце задання 2? Назавіце пісьменніка.
У тэкст задання 2 упішыце тыя творы, назвы якіх не ўказаны.
Як называецца сінтаксічны прыём аднолькавай пабудовы суседніх сказаў, ужыты ў тэксце задання 2?

*Максімальная колькасць балаў – **4**.*

______________________________________________________________________________

______________________________________________________________________________

**Заданне 9.** Вялікі Гётэ казаў: «*Хто зразумець паэта хоча – у яго край павінен крочыць*».
Адкажыце, памяць якіх літаратараў і чаму ўвекавечана ў дадзеных мясцінах.

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*

1. У 1938 годзе ў горадзе Навагрудку адкрыты Дом-музей сусветна вядомага паэта беларускага паходжання. Сёння гэта не толькі біяграфічная музейная экспазіцыя – гэта і музей "пад адкрытым небам". Помнік слыннаму паэту, адкрыты ў 1992 годзе, знаходзіцца непадалёк ад Кургана Бессмяротнасці і Фарнага касцёла. Скульптар Валерый Янушкевіч бронзавай паставай падкрэсліў рамантычны талент паэта.

______________________________________________________________________________

______________________________________________________________________________

2. Першы ў Беларусі помнік гэтаму народнаму паэту адкрылі ў 2014 годзе ў Мядзелі. Бронзавая пастава паэта ў поўны рост усталяваная на гранітным пастаменце вышынёй адзін метр. Недалёка ад яе знаходзіцца валун з картушам у выглядзе разгорнутай кнігі, дзе выбітыя радкі з верша паэта: «Ёсць адна песня песняў – пра Радзіму».

______________________________________________________________________________

______________________________________________________________________________

3. Помнік гэтаму народнаму паэту ўсталяваны ў вёсцы Мікалаеўшчына ў 1972 годзе. У ваколіцах вёскі з 1956 года размясціўся літаратурна-мемарыяльны музей. Тэрыторыя заказніка ўключае літаратурна-мемарыяльны комплекс Смольня (дзейнічае з 1967 г.), сядзібы Акінчыцы (з 1982 г.), Альбуць (з 1990 г.) і Ласток (з 1997 г.).

______________________________________________________________________________

______________________________________________________________________________

4. Помнік выдатнаму дзеячу эпохі Адраджэння ўсталяваны ў 1982 годзе ў Нясвіжы. Бронзавая постаць славутага продка вышынёй 2,85 м велічна ўзвышаецца на гранітным пастаменце. Ва ўзнятай руцэ кніга з эмблемай сонца — сімвалам святла і ведаў. Спакойная пластыка паставы стварае вобраз вялікай духоўнай сілы.

______________________________________________________________________________

______________________________________________________________________________

**Заданне 10.** Назавіце літаратурныя жанры, азначэнні якіх даюцца ніжэй.

*Максімальная колькасць балаў – **3**.*

1. Апавядальны твор фальклору, прысвечаны жыццю рэальных асоб і гістарычных падзей, заснаваны пераважна на сапраўдных гісторыях або тых, якія верагодна маглі быць.

______________________

2. Лірычны верш, прасякнуты сумным настроем з прычыны грамадскай несправядлівасці, асабістага няшчасця, разважанняў пра жыццё і смерць і інш.

______________________

3. Аднаактавы камедыйны бытавы твор з займальнай інтрыгай, песнямі-куплетамі, часам танцамі.

______________________

4. Старажытны аповед пра жыццё святых.

______________________

5. Мастацка-дакументальны твор, у аснове якога ляжаць сапраўдныя факты з жыцця і дзейнасці рэальных людзей.

______________________

6. Драматычна напружаны, сюжэтны ліра-эпічны твор гераічнага, казачна-фантастычнага ці легендарнага зместу.

______________________

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Намеснік старшыні
абласнога арганізацыйнага камітэта
Рэспубліканскай алімпіяды,
першы намеснік
начальніка ўпраўлення адукацыі
Віцебскага аблвыканкама

Л.М.Сцяпанаў

”05“ лістапада 2015 года

# Тэмы вусных выказванняў

## XI клас

### Білет 1

1. Уся паэзія – ад кахання.

   *Уладзімір Караткевіч*

2. Вочы маці!
   У доўгія зімнія ночы
   Вы над намі
   Вясёлымі зоркамі ззялі…

   *Ніл Гілевіч*

### Білет 2

1. Літаратурны твор, які мяне ўразіў.

2. Магутнае слова ты, роднае слова!

   *Янка Купала*

### Білет 3

1. Гісторыя маёй сям’і.

2. Усё мае свой працяг жыцця,
   Апроч няпраўды.

   *Максім Танк*

### Білет 4

1. Ты – боль, паэзія. Ты – бой.
   Ты – праўда непрыступнай вежы.

   *Леанід Галубовіч*

2. 21 лютага адзначаецца Міжнародны дзень роднай мовы.

## Білет 5

1. Святлана Алексіевіч – нобелеўскі лаўрэат: "Дзякуй маім настаўнікам – Адамовічу і Быкаву".

2. Бедны той, хто не мае скарбаў вечных – скарбаў душы.

*Цётка*

## Білет 6

1. У нашым класе, у нашай школе ёсць такія традыцыі…

2. Хто згубіў памяць – згубіў усё.

*Уладзімір Караткевіч*

## Білет 7

1. Жыццём сваім, справай і смерцю вялікі – Кастусь Каліноўскі.

*Уладзімір Караткевіч*

2. Песня – душа народа.

## Білет 8

1. Гістарычнае мінулае ў нашай літаратуры.

2. Уся вартасць людская жыцця ў тварэнні.

*Ларыса Геніюш*

## Білет 9

1. Што такое чалавек перад знішчальнай сілай бесчалавечных абставін?..

*Васіль Быкаў*

2. Збіраўся скарб, струменіўся няспынна,
Вясёлкавым ірдзеннем мне спяваў…

*Якуб Колас*

## Білет 10

1. Родны мой горад. (Родная мая вёска.)

2. Сілен, княжа, караць, галаву сілен зняць, –
Не скуеш толькі дум ланцугамі.

*Янка Купала*

## Білет 11

1. Музыка ў маім жыцці.

2. Чалавек – гэта цэлы свет.

*Кузьма Чорны*

## Білет 12

1. Я сёлета скончу школу…

2. Колькі вызнаў і вынес ты, краю мой мілы!

*Генадзь Бураўкін*

## Білет 13

1. Нязгасная зорка паэзіі нашай – Максім Багдановіч.

*Алесь Бачыла*

3. З легендаў і казак былых пакаленняў…

*Максім Танк*

## Білет 14

1. Свет нас прымаў як народ
   Па адной палачанцы.

*Данута Бічэль*

2. Веды і дабрачыннасць як свечка, што асвятляе чалавеку шлях і не дае заблукаць.

*Сымон Будны*

## Білет 15

1. Там, дзе я жыву, варта паставіць помнік…

2. Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі.

*Францішак Багушэвіч*

## Білет 16

1. Быў. Ёсць. Буду.

*Уладзімір Караткевіч*

2. О Беларусь, мая шыпшына!
   Зялёны ліст, чырвоны цвет…

*Уладзімір Дубоўка*

## Білет 17

1. Я родам з Адраджэння. Ды цяпер
   Усім часам, прасторам я належу.

*Мікола Арочка*

2. Чалавеку патрэбна не слава…

*Сяргей Грахоўскі*

## Білет 18

1. Мой любімы беларускі пісьменнік.

2. Не дай мне Бог духоўным стаць бадзягам,
   Без памяці жывой, без каранёў…

*Васіль Зуёнак*

## Білет 19

1. Біблія – дзівосная рака…

*Францішак Скарына*

2. Люблю цябе і слухаю, прырода, такая блізкая парой любой!

*Васіль Жуковіч*

## Білет 20

1. Купала і Колас, вы нас гадавалі…

   *Пятрусь Броўка*

2. Дарогі ўсёй зямлі маёй
   Гудуць у стомленых нагах.

   *Уладзімір Караткевіч*